Тыднёвік Магілёўскі

№ 30 (30)
5.12.97

Рэдактарскія нататкі

...На чале са свабодай

Вы чытаеце чарговы нумар газэты пасля тыднёвага перапынку, які быў звязаны з фінансавымі праблемамі. Такім чынам, апошні раз мы «бачыліся» два тыдні назад. За гэты час адбыліся падзеі, на якія наша газэта не мела магчымасці адгукнуцца аператыўна. Не ўсе з іх аднак мелі праходзячую грамадскую вартасць — і гэта дае нам падставу, не пагледзячы на нібытое спазненне, выказацца на іх конт. Гэта і зробім.

Першы факт грамадскага жыцця, па небяспечнасці наследкаў для лёсу краіны, — закрыццё газэты «Свабода». Мала хто помніць з гісторыі, а магчыма і мала хто ведае, што «чырвоны тэрор» у маладой рэспубліцы Саветаў, які шалёна перарос у сталінскія злачынствы і пры ўсіх «оттепелях» працягваўся да распаду СССР не толькі ў гэтай імперыі, але і ў краінах «сацыялістычнага лагеру» — што тэрор гэты пачаўся з ленінскага дэкрэту аб закрыцці газэтаў, якія крытыкавалі новую ўладу. Тагачасныя перыядычныя выданні, што не спяшаліся перарасці ў прапагандысцкае падначаленне да бальшавікоў, знішчаліся спецыяльна ўтворанымі «трыбуналамі печати». Іх прысуды, што насілі «часовы» характар, так і не былі, зразумела, ніколі адмененыя. У нас функцыю трыбунала ўзяў на сябе Гаспадарчы суд, які па хуткасці — гэта заняло 15 хвілінаў — прыняцця прысуда можна параўнаць з «военно-полевым судом».

І тады, і цяпер газэты судзілі не за фактычныя памылкі, распаўсюджанне плётак і хлусні, антыканстытуцыйныя заклікі, а — за меркаванні і думкі (зразумела, непрыемныя), і за праўду. Тагачасныя і цяперашнія «матросы Железняки» кіраваліся выключна «палітычнай мэтазгоднасцю», якая заўсёды азначае не стратэгічнае служэнне народу, а тактычнае ўслужэнне ўладзе... Аднак такой уладзе, што гэтага патрабуе, немагчыма ўгадзіць. Заўтра ж чарговымі падсуднымі становяцца тыя, хто былі суддзямі ўчора... Такая ўсюды і заўсёды логіка «палітычнай мэтазгоднасці», што ўзнімаецца вышэй за законы і мараль.

Таму, па той жа навуцы логікі, урокі гісторыі вымагаюць, каб першай за «Свабоду» заступілася газэта «Советская Белоруссия». Яна ж, як і іншыя «дзяржаўныя» (двукоссе тут да месца) сродкі інфармацыі, маўчыць.

Гэта непакоіць і палохае не менш самога факту закрыцця дэмакратычнай газэты. Бо сведчыць пра тое, што дыктатура зайшла надта далёка. Зайшла, як гаворыцца, «без стука» не толькі ў «свае» ведамствы (суды, пракуратуры, міліцыю), але і ў інстытуты, якія грамадства прызнае за дэмакратычныя. Што будзе далей, не ведае нават і сам Лукашэнка.

Ведаюць, на шчасце, тыя, каго аб'ядноўвае «Хартыя-97». Яе абвяшчэнне — гэта другая падзея, што прыйшлася на перапынак у выхадзе нашай газэты. (Хаця мы, калі заўважылі чытачы, былі першымі, хто паведаміў аб тым, што ў краіне ідзе работа над гэтым дакументам). Усе, хто склаў Хартыю, першыя падпісалі яе і заклікаюць далучыцца іншых пры ўсіх палітычных рознагалоссях, ведаюць адно: барацьба за волю і незалежнасць, дэмакратыю і сумленне, праўду і добрую будучыню дзяцей, культуру і мараль... за ўсё тое, што нішчыць і разбурае дыктатура, не бывае нідзе і не будзе ў нас лёгкай і кароткай. Бо гэта барацьба выклікае перамогі не над [illegible] праўнай уладай, а над сабой: самай цяжкай, самай пакутнай і самай непрыемнай. Але і самай годнай, самай радаснай і самай высакароднай перамогі. Яна і ёсць адзіны трывалы грунт для арганізацыі прыстойнага жыцця.

З чаго пачаць шлях да яго кожнаму з нас? З далучэння да Хартыі, з адкрытага і шчырага далучэння. Ва многім не больш, чым сымбалічны гэты ўчынак надасць тым не менш сілы і права паважаць сябе, а значыць — жыць з надзеяй і верай у родны народ і зямлю.

Два мінулыя тыдні ўмясцілі ў сабе і іншыя падзеі. Але рэдакцыя выбрала гэтыя, каб заявіць:

1. Заснавальнікі газэты асацыяцыя «Кола сяброў» і рэдакцыя ТЫДНЁВІКА выказваюць рашучы пратэст супраць нічым неабгрунтаванага закрыцця газэты «Свабода» і патрабуюць адмены гэтага антыдэмакратычнага рашэння.

2. Заснавальнікі газэты і рэдакцыйны калектыў далучаюцца да Хартыі-97.

Мы ведаем, што і вы, хто чытае сёння нашу газэту, — з намі. Напалоханая ўлада абвясціла Хартыю-97 «подрывным документом», а цэнтрам скаардынаванага наступу аб'яднанай апазыцыі на «президентские завоевания» — газэту «Свобода».

Ня будзем пярэчыць. Дазволім сабе толькі адну папраўку: здымем з яе назвы двукоссе. Пасля гэтага і сапраўды даверым СВАБОДЗЕ быць каардынатарам нашага жыцця. Аж да самой яе перамогі... І той, што ў «двукоссі», зразумела, — таксама.

ГЕНАДЗЬ СУДНІК.

Апошнія весткі з лякарні

Валадар Цурпанаў, на дзень падрыхтоўкі газэты да друку, працягвае трэці тыдзень знаходзіцца ў лякарні. Такія наследкі ягонай 10-сутачнай турэмнай галадоўкі пратэсту супраць незаконнага затрымання і асуджэння чатырох актывістаў дэмакратычных арганізацый Магілёва падчас правядзення мітынгу 7-га лістапада (падрабязнасці ў нумарах 28 і 29 «Тыднёвіка»). Медычны персанал лякарні завода штучнага валакна, суседзі па палаце і сябры Валадара праяўляюць да яго павагу, уважлівасць і клапатлівасць. Гэта многае значыць у выздараўленні, аднак медычныя наследкі галадоўкі, псіхалагічнае адчуванне несправядлівасці пакарання і жорсткія ўмовы утрымання ў ізалятары пераўзыходзяць пакуль сілу лекаў і чалавечай цеплыні. Па меншай меры яшчэ два тыдні Валадару прыйдзецца жыць у рэжыме лекавай установы.

Сябры зычаць Валадару хутчэйшага і надзейнага выздараўлення.

Уласн.інф.

Валадар Цурпанаў: ліст да сяброў

Добры дзень, шаноўныя!

Я вельмі ўсіх, хто хваляваўся падчас майго зняволення, а цяпер вось — лекавання. Шчырая, сардэчная ўдзячнасць сябрам, аднадумцам, палітычным, знаёмым і незнаёмым людзям — усім, чыя падтрымка й дапамога падтрымлівалі мяне, сілкавалі надзею на перамогу, перадусім — над сабой. Дзякую вас, дарагія!

Я дзякую дзядулю і ягоных унучак, маіх дачушак. І прабачаюся перад імі і, акрамя іх, болей ні перад кім, за іхныя неспакоі і турботы. Дзякуй за вашае трыванне ды разуменне.

Я ўдзячны лёсу за ягоныя падарункі, якога мажліва я і не варты. Гэты падарунак не мае кошту, а каштоўнасць ягоная ніяк не ахопліваецца. Завецца ён — сяброўства. Я дзякую лёс за тое, што мяне атачае гэтулькі сяброў! І ці змагу я адплаціць тым жа?!

Я прашу, шаноўныя, не крыўдаваць, аднак я не прымаю вашых закідаў ды просьбаў быць болей абачлівым, цішэйшым. Ці ж вы ўяўляеце мяне іншым?!

Адказам жа на пытанне: «А што будзем рабіць далей?» — будзе гэтыя вершы. Яго прысвячаю вам, дарагія сябры! Прымайце, як сведчанне ўдзячнасці.



Змагарам

Прастора навокал — быльнег
непралазны
Суцэльнаю, нібы бэтоннай, сьцяной
З маўкліва-упартых, за ўсе
безадказных,
Рахманых (ці дзіўх?) «простых
саўкоў».
Час пераменаў... Тых слоў
спалучэньне,
Нібы праклён найвялікшай вагі.
— Жыве Беларусь! — толькі зноў
далучэньне
Да большага «брата» галасуюць
рабы.
Калі гэты «брат» зь бізуном
ды астрогам
Прыходзіў з апошняй візытай
сваёй —
Пасьля засталося ня надта і многа
Гатовых змагацца за Волю крывёй.
Ня сёньня у двор гарацкі і сялянскі
Воля Радзімы «прасіцца»
прыйшла...
А колькі ўжо год «саюзныя» няньки
Спрабуюць скруціць — каб у стойла
зайшла!
Чаму ж перавагу над Воляй трымае
Люд, што зь цямрэчы ідзяў старых
Ня хоча вылазіць? (Глуздоў
не хапае?!)
Зноў цягне ў пячору мрояў сваіх
Ды толькі ў Волі свае абаронцы.
За Волю ўставалі заўжды —
Змагары!
Бо ім не хапала паветра і сонца
У багна-атрутным тым гушчары

Прысвячаю сябрам

Заўжды было мала Змагарнікам
Волі,
Але яны сілай вялікай былі,
Бо побач стаялі — раменны
ў рамёны!
Натхняла іх Веліч ды Слава Зямлі.
Зямлі, што калісьці такіх даравала —
Мінуўшчыны Веліч — дачок і сыноў:
Рагнеда! Скарына! Сьвятая
Прадслава!
Ўсяслаў-Чарадзей! Вітаўт!
Яська-герой!
Гмах Велічы слаўнага веку былога,
Здаецца, ня мае ў глыбінях канца...
А мы — як працягам кірунку
другога —
Ці здольныя ўкласьці свайго ў ім
вянца?!
Ці здольныя мы ўзьняць
бярвенца-другое
На той ганаровы узровень жыцьця,
Дзе Воля й Радзіма адно бяз адное
Існаваць непарыўна ня будуць?
Хаця...
Мары што зоркі, пяцяць
ды згараюць.
Сёньня наўкола шалёны паўзмрок:
Зь цёмных пячор злыдні зноў
выпаўзаюць —
Каб Волю й Радзіму загнаць
у астрог.
Яны ўжо скутыя спрэсу кайданы,
Злыдні бізун дзеля іх Змагароў
Раз-пораз, ды так асалодна,
ўздымаюць —
Імкнуцца зь іх «выбіць» да Волі
любоў.
Ды марныя высілкі: Воля й Радзіма
Для іх непарыўнымі сталі даўно.
Навошта ім Воля у добрай хаціне,
Калі на Радзіму надзелі ярмо?!
Навошта Радзіма, што вартая жалю,
Бо дыхаць не можа, адно што —
хрыпець?
Яны толькі ў вольнай старонаачцы
маюць
Адвечную мару — шчасьліва
запець.

8-20 лістапада 1997 г.
Астрог-шпіталь, Магілёў.

Сустрэча з нашым паэтам



Жадаю сілаў і мужнасьці у нашым выстойваньні супраць рэжыму, у нашым стаяньні за Беларусь! У радасьці, вядома, і каханьня, і посьпехаў небанальных!
30.11.97 г.
Славамір Адамовіч

У нядзелю, 30-га лістапада, госцем магілёўскага згуртавання «Патрыёты Бацькаўшчыны. Рух у Эўропу» быў паэт Славамір Адамовіч. У рамках новай праграмы згуртавання над назвай «Гасцёўня Патрыётаў» Славамір даў прэс-канфэрэнцыю, пасля якой адбылася сустрэча з моладдзю.

Гаворка ішла аб сённяшнім стане беларускага грамадства, аб магчымых шляхах і мэтадах процістаяння дыктатарскай уладзе, і больш шырока — аб тым, як захаваць у сябе годнасць і сумленне, быць Чалавекам і Грамадзянінам. Таксама Славамір паведаў аб сваёй працы ў «Нашай Ніве», паказаў сыгнальны экзэмпляр кнігі вершаў, куды ўвайшлі творы, якія былі напісаныя за кратамі. Пакуль што гэты праект, на жаль, застаецца нерэалізаваным.

Думаецца, што галоўным на гэтым спатканні з моладдзю было менавіта само спатканне, размова з чалавекам, які ўжо прайшоў цяжкі шлях пакутаў і выпрабаванняў, які ўжо ахвяраваў сабой дзеля Бацькаўшчыны. І тое, што ён выйшаў з турмы жывым і свабодным, прагным творчай працы і вольнага жыцця —найлепшы доказ таго, што справа Беларускага Адраджэння мае сапраўдных і неўміручых носьбітаў. Што яна, гэтая справа — жывая крыніца, якая прабьецца скрозь любы, нават самы таўшчэзны бэтон.

А напрыканцы сустрэчы для чытачоў і прыхільнікаў ТМ Славамір пакінуў свой аўтограф.

В.С.

*Супрацоўнік рэдакцыі ТЫДНЁВІКА **Віктар Суднік** на працягу двух тыдняў праходзіў стажыроўку ў Польшчы. Яна складалася з двух частак. Спачатку — стаж у рэгіянальнай польскай газэце. Потым —канфэрэнцыя-сэмінар для ўсіх удзельнікаў праекту з польскага і беларускага бакоў.*

Усяго ў гэтым мерапрыемстве бралі ўдзел прадстаўнікі 11-ці мясцовых незалежных беларускіх газэтаў з Маладэчна, Воршы, Івацэвічаў, Слоніма, Гародні, Берасьця, Віцебска, Баранавічаў, Глыбокага і Магілёва. Арганізатарам і спонсарам выступіла амэрыканская фундацыя IDEE (Інстытут на карысць дэмакратыі ва Ўсходняй Эўропе), а непасрэдным выканаўцам — яе польская філія.

Паколькі праграма побыту ў Польшчы была вельмі разнастайнай і даволі працяглай па часу, мы мяркуем даць нататкі нашага карэспандэнта ў некалькіх нумарах ТМ. Сёння — іх першая частка.

СВУПЭЦКІЯ НАТАТКІ

Досьвед Вольнага Панства

Горад.

Невялічкі гарадок Свупца (Słupca) належыць да Конінскага ваяводства, якое ў сваю чаргу ўваходзіць у Вялікапольскі рэгіён (Wielkapolska). Колькасць насельніцтва ў ім складае прыкладна 6 мільёнаў чалавек. У Коніне — 80 тысяч насельніцтва, у Свупца —15 тысячаў.

Адразу хачу зазначыць, што ў Польшчы няшмат вялікіх гарадоў, і таму захавалася й існуе яшчэ ад былых часоў вялікая культурная спадчына менавіта маленькіх мястэчак. На прыкладзе Свупца магу зазначыць, што гэта сапраўды вельмі прыемная, адначасова старажытная і сучасная спадчына, якая з дзяцінства выхоўвае чалавека ў рэчышчы патрыятызму, адданасці сваёй роднай мясціне як у яе мясцовым, так і ва ўсеагульнапольскім значэнні.

У Свупца ёсць свая Заканадаўчая Рада, якую абіраюць жыхары. Налічвае гэты орган 20 асобаў. Бурмістр — кіраўнік выканаўчай улады — выбіраецца Радай, але ў хуткім часе пасля маючай адбыцца рэформы ён будзе выбірацца ўсім насельніцтвам. Дарэчы, у першы дзень майго побыту мяне запрасілі на паседжанне Рады, дзе асноўным пытаннем былі выбары 5-ці асобаў сярод 9-ці кандыдатаў на ўзнагароджанне адмысловым мэдалём за заслугі перад горадам. Ва ўтульным пакойчыку, у спакойнай сяброўскай атмасферы гэтыя 5 кандыдатаў былі абраныя шляхам тайнага галасавання. Потым, 11-га лістапада, у Дзень Незалежнасці Польшчы, мэдалі былі ім уручаныя на Плошчы Волі, падчас адкрыцця Помніка палякам, якія аддалі свае жыццё за свабоду.

Мушу таксама падкрэсліць адразу, што нікому з тых палякаў, з кім я меў гутаркі, а гэта былі журналісты мясцовай газэты і радыё, бурмістр і яго намеснікі, дэпутаты, упадальнікі крамаў, і г.д., — ня трэба было даводзіць, а тым больш даказваць (як, на жаль вельмі часта ў Магілёве), што галоўны падмурак дастойнага і свабоднага жыцця, усялякага дабрабыту — менавіта любоў да сваіх каранёў, традыцый, гісторыі, а найперш — карыстанне **сваёй мовай**, у нашым выпадку — беларускай. Дарэчы, што тычыцца беларускай мовы, то амаль усе мае суразмоўцы разумелі мяне (а я іх) без перакладу, а калі высвятлялася, што шмат якія словы і цэлыя выразы гучаць аднолькава — і па-польску, і па-беларуску — тут ужо мы разам адчувалі сапраўднае замілаванне і пяшчоту адзін да аднаго.

Працягваючы тэму горада Свупца, скажу, што асартымэнт самых розных крамаў, якіх, як мне падалося, нават больш, чым у 400-тысячным Магілёве, такі, што свае пачуцці я выражаў толькі адным словам: фантастыка! Амаль усе крамы, рэстарацыі, пабы і бары — у прыватнай уласнасці, чысценькія і ўтульныя, часцей за ўсё гэта сямейны бізнэс. Увечары, калі пасля 17-й гадзіны ў асноўным усе крамы зачыняюцца (акрамя тых, якія працуюць non-stop), жыхары, асабліва маладзейшыя, збіраюцца ў пабах, каб пагутарыць, пасьпяваць і, вядома, выпіць. У кожным пабе ёсць білярд, іншыя гульні, багаты выбар напояў. Некаторыя бары маюць даўнюю гісторыю — у іх на відным месцы выстаўлены рэліквіі: старыя бутэлькі, бакалы, і г.д. Анідзе няма напружнасці, лаянкі, а тым больш бойкі. Людзі адпачываюць пасля працоўнага дня.

Вуліцы ноччу асветленыя так, як, можа быць, на Беларусі толькі ў Менску ў раёне ад плошчы Незалежнасці да чыгуначнага вакзалу. Усе тавары ў крамах праз шкло відаць гэтаксама як днём.

Думаю, што варта аддаць адзін абзац проста пад пералік (няпоўны) тых паслуг, якія існуюць для людзей у 15-тысячным мястэчку: крамы па продажу мужчынскага, жаночага і дзіцячага адзення, абутку, бялізны, шматлікія прадутовыя шопы, пякарня, фотастудыя, музычныя крамы, пракат аўто, асяродак спорту (корты, стадыён), лазні, саўны, кнігарні, крамы па продажу вылічальнай тэхнікі, офіснай і хатняй мэблі, сталярная і іншыя майстэрні, аптэкі, паліклініка і шпіталь з сучасным абсталяваннем, тры філіі асноўных польскіх банкаў, бібліятэкі, фітнэс клуб, Дом культуры, кінатэатр, таксі, адвакацкія канторы, нарэшце, мясцовы аддзел руху «Салідарнасць»...

У горадзе ёсць тры дзіцячыя садкі, тры пачатковыя школы (8 год навучання), некалькі спэцыяльных вучэльняў, агульнаадукацыйны ліцэй, маленькі заводзік па вырабу сталёвых канструкцый, гарчычны млын, аўтазапраўка, спэцыяльная фабрыка, дзе працуюць інваліды і людзі, якія перайшлі пэнсыённы рубеж. Ёсць 75-мэтровая антэна для ўладальнікаў сотавых тэлефонаў, але будуецца яшчэ адна, бо ў краіне існуюць некалькі сыстэмаў сотавай сувязі.

Але ж, канешне, галоўнай адметнасцю любога польскага горада, незалежна ад яго памераў, ёсць касцёл. У Свупца набажэнствы праводзяцца ў двух касцёлах (абодва можна аднесці да барочнай архітэктуры). Адзін з іх —Касцел Святога Крыжа, закладзены ў XVI стагоддзі, зьяўляецца адным з трох галоўных польскіх санктуарыяў —духоўных здабыткаў нацыі — нароўні з Вострай Брамай (тут я мушу паведаміць, што пасля маёй невялічкай «лекцыі» польскія калегі пагадзіліся з тым, што Вострая Брама, як і Вільня — наша агульная культурная спадчына) і кляштарам у мястэчку Ясна Гура.

Ксёнз касцёлу Святога Крыжа паставіўся да беларускага журналіста вельмі добра, і пасля імшы правёў для мяне адмысловую экскурсыю па самому будынку касцёла, распавёў пра яго славутую гісторыю. Я даведаўся, што зараз, на працягу года, каля 100 тысячаў каталікоў з усяе Польшчы спэцыяльна прыязджаюць у Свупца каб памаліцца менавіта ў гэтым прыгожым драўляным касцёле.

Другі касцёл трохі падобны на наш, магілёўскі, і па сваіх памерах, і па архітэктуры. Асабліва шмат людзей збіраецца ў ім у нядзелю. Дарэчы, у Свупца няма, як мне паведамілі, ніводнага некаталіка. Калі я бачыў групы дзетак, прыкладна 6-ці — 7-мі гадовага ўзросту, якія адны, без суправаджэння бацькоў, з радаснымі ўсмешкамі спяшаліся ў нядзелю на ранішнюю імшу, я даведаўся, здаецца, нашмат больш аб Польшчы, чым падчас шматлікіх гутарак з дарослымі.

...Асабліва мне падабалася ў Свупца адсутнасць грамадскага транспарту. Аўтобусы ходзяць толькі ў іншыя гарады. Людзі шпацыруюць ці ездзяць на аўтамабілях. Паветра чыстае, людзі ветлівыя, амаль усе знаёмыя, паўсюдна чуваць прывітанні, пажаданні здароўя, поспехаў, нават па некалькі разоў на дзень. Самая распаўсюджаная зьява, якую можна пабачыць ня толькі ў Свупца, але і ў любой вёсцы побач — гэта сатэліт (спадарожнікавая антэна). Напрыклад, на сценах пяціпавярховага пяціпад'езднага будынку такіх сатэлітаў я налічыў каля 30-ці. Але ж большасць жыхароў, як у Свупца, так і ў сельскай мясцовасці, жыве ўсё ж у асобных дамах, на тэрасах і вокнах якіх звычайна вісяць бела-чырвоныя польскія сцягі, дзе-нідзе яны перамяжоўваюцца з выявамі герба Свупцы — жоўтага крыжа на блакітным фоне. Як жартуюць самі жыхары — ці то на Украіне жывем, ці то ў Швэцыі. Напачатку стагоддзя мяжа, што падзяляла дзве імпэрыі — Расейскую і Аўстра-Вугоргскую — праходзіла ў 10-ці км ад Свупца, а сам горад належыў да ... імпэрыі Раманавых. Дарэчы, менавіта па гэтай дарозе мы з рэдактарам мясцовай газэты ехалі ў друкарню, аб якой я больш падрабязна паведамлю ў адпаведным раздзеле.

Газэта.

Рэдакцыя «Газэты Свупэцкай» займае другі (ён жа апошні) паверх прыгожага будынка ў самым цэнтры горада. Гэтае памяшканне зьяўляецца ўласнасцю газэты. У штат рэдакцыі ўваходзяць 10 чалавек, а ўвогуле тых, хто піша ў газэту, налічваецца каля 30-ці асобаў. Аўтары атрымваюць ганарары, што адрознівае (пакуль?) польскую прэсу ад СМІ ў Заходняй Эўропе, дзе ганарарнай сістэмы няма. Тры чалавекі начале з рэдактарам, сп. Яцэкам Барткавякам, працуюць у газэце ад самага пачатку —з 1989-га году. Тады газэта выходзіла нерэгулярна, з пэўнымі цяжкасцямі, бо толькі на некалькі месяцаў раней у Польшчы адбыліся свабодныя выбары, на якіх перамагла «Салідарнасць». Штаб месціўся ў падвальчыку прыватнага дома, а друкаваўся зусім невялічкі тады наклад дзякуючы таму, што адзін з сяброў рэдакцыі быў добра знаёмы з рабочым друкарні.

Дарэчы, сп. Барткавяк — гісторык па адукацыі, вядомы і паважаны ў рэгіёне грамадскі і культурны дзеяч, інтэлігентны і ветлівы чалавек. Менавіта ён быў вядучым урачыстых цырымоніяў на Дзень Незалежнасці ў Свупца (аб якіх будзе ніжэй). Цікава, што ён не мае асобнага кабінэту ў рэдакцыі, а вось працы ў яго многа, і яна нясе не толькі вузка-журналісцкі характар, але скіраваная перш за ўсё на агульна-грамадскія патрэбы горада.

Спачатку газэта мела выразна палітычны дэмакратычны накірунак. Але з цягам часу, калі ў краіне ўсталявалася дэмакратыя, людзі пачалі прагнуць больш простай інфармацыі, якая б магла задаволіць звычайныя патрэбы жыхароў менавіта свайго маленькага мястэчка і ваколіцаў.

Зараз «ГС» выходзіць штотыднёва накладам 4 700 асобнікаў. Палосаў у газэце можа быць ад 12-ці да 20-ці. Фармат — нашай звычайнай «раёнкі». Пераважаюць матэрыялы інфармацыйнага характару аб культурных, спартыўных, забаўляльных падзеях у рэгіёне. Ёсць у газэце калонка паліцэйскіх навінаў, старонка водклікаў чытачоў, артыкулы на гістарычную тэму, крыжаванкі і, канешне, шмат рэкламы і аб'яваў.

Практычна ўвесь наклад газэты разыходзіцца. Яна распаўсюджваецца акрамя Свупца яшчэ ў васьмі гмінах (сельскіх раёнах). Канкурэнцыю газэце складаюць некалькі тыднёвікаў, якія выходзяць у Коніне і ў шэрагу гарадкоў накшталт Свупца ў радыюсе 10-20 км. Але ў самой Свупца іншага выдання няма. Падчас майго побыту ў горадзе рэдакцыя вымушана была падвысіць кошт газэты з 1 злотага 30-ці грошай да 1 зл. 40-ка. Тлумачыцца гэта вельмі проста, як гэта звычайна бывае і ў нас: выраслі цэны на друкарскія паслугі. Але калектыў газэты паабяцаў чытачам ужо напачатку года палепшыць якасць друку і змяніць да лепшага саму афарбоўку сваіх нумароў.

Зазначу, што ва ўсіх падобных выданнях супрацоўнікі рэдакцыяў самі дакладаюць у кожны асобнік сваіх газэтаў бясплатны (для чытачоў і падпісчыкаў) каляровы дадатак з тэлепраграмай. Акрамя агульнапольскіх каналаў гледачы Свупца маюць магчымасць глядзець перадачы з цэнтра ваяводства — Коніна, з Гданьску, Пазнані, і г.д. Уладальнік сатэліта можа таксама за асобную плату набыць дадатковыя кадаваныя каналы.

Пры мне ў рэдакцыю завітаў чалавек сталага веку, які ўжо даўно эміграваў у Нямеччыну, а цяпер спэцыяльна прыехаў, каб ахвяраваць грошы на памятную дошку з імёнамі загінуўшых палякаў падчас Другой сусветнай вайны. Пробашч касцёла даў яму згоду на тое, каб яна была прымацавана потым на касцёльным будынку.

(Далей будзе).

ХАРТЫЯ 97
CHARTER-97

Мы, грамадзяне Рэспублікі Беларусь, заяўляем, што дзеянні цяперашніх уладаў накіраваныя на знішчэнне неад'емных правоў і свабодаў чалавека. У краіне растаптаны асноўны закон —Канстытуцыя. Беларускаму народу адмоўлена ў праве абіраць сваіх прадстаўнікоў ва ўладныя структуры. Вядзецца сыстэматычны наступ на свабоду слова, на правы грамадзянаў ведаць рэальнае становішча ў краіне. Разбураюцца нацыянальныя культура і школа, дыскрымінуецца беларуская мова. Штодзённы рост цэнаў і жабрацкі заробак ставяць на мяжу існавання сотні тысячаў сем'яў. Напярэдадні XXI стагоддзя ў цэнтры Эўропы ўсталяваўся дыктатарскі рэжым. Дзесяць мільёнаў людзей апынуліся ў палоне гвалту.

Мы верым, што наша Радзіма вартая свабоды і росквіту. Мы верым, што менавіта такой зробяць яе нашы супольныя намаганні. Нас натхняе прыклад свабодных народаў, якія прайшлі гэты шлях раней за нас. Мы памятаем, як група мужных чэшскіх і славацкіх праваабаронцаў падпісала Хартыю 77, у якой заклікала да барацьбы з таталітарызмам у сваёй краіне, і як праз некалькі гадоў ад чырвонай дыктатуры ва Ўсходняй Эўропе не засталося сьлядоў. Людзі ў гэтых краінах атрымалі магчымасць вольна будаваць сваё жыццё і дасягаць дабрабыту.

Мы ня можам больш цярпець гвалт, парушэнні законаў, злачынствы супраць усяго народу і кожнай асобы. Мы будзем салідарныя з кожным, хто змагаецца за свае правы, за свабоду і добрыя ўмовы жыцця для сваіх сем'яў.

Мы вызнаем розныя палітычныя погляды і рэлігійныя веравызнанні, але нас аб'ядноўвае любоў да свабоды й Бацькаўшчыны. Падмуркам нашай падрыхтаванасці да супольных дзеянняў у справе вызвалення беларускага народу зьявіцца павага да поглядаў і веры адно аднаго. Наша салідарнасць пераможа гвалт і бессаромную хлусню. Усе, хто выйшаў на шлях змагання за свае правы і чалавечую годнасць, павінны быць упэўненыя ва ўсеагульнай падтрымцы.

Мы спадзяемся на разуменне сусветнай супольнасці і салідарнасць усіх сілаў, якія разумеюць небяспеку ўсталявання на пастсавецкай прасторы новай карычневай імпэрыі. Аскепак таталітарызму павінен быць выняты з цела Эўропы.

Мы, грамадзяне Беларусі заяўляем сёння пра сваю адказнасць за лёс краіны, за будучыню нашых дзяцей. Мы зробім Беларусь вольнай, незалежнай, багатай эўрапейскай дзяржавай, дзе абароненыя правы чалавека, дзе няма палітзняволеных, дзе ўсе маюць годныя ўмовы для жыцця.

Мы заклікаем усіх грамадзянаў Беларусі далучыцца да нашай Хартыі, каб супольна змагацца за свае правы і свабоды, за аднаўленне дэмакратыі і законнасці ў нашай краіне.

Жыве вольная незалежная Беларусь!

Сярод першых ста чалавек, якія падпісалі Хартыю 97, такія вядомыя ў Беларусі людзі як Славамір Адамовіч, Уладімір Арлоў, Рыгор Барадулін, Лявон Баршчэўскі, Васіль Быкаў, Віталь Васількоў, Вінцук Вячорка, Ніл Гілевіч, Сямён Домаш, Павел Знавец, Кася Камоцкая, Павел Карназыцкі, Алена Лукашэвіч, Сяргей Абадоўскі, Міхаіл Пастухоў, Тацяна Процька, Валеры Сівуха, Генадзь Суднік, Алег Трусаў, Юры Хадыка, Віктар Шалкевіч, Павел Шарамет.

Хартыя 97 ______________________
(Прозвішча, імя)

____
(Подпіс)

Паважаныя чытачы! Мы заклікаем патрымаць нашу ініцыятыву. Свае подпісы пад гэтым дакумэнтам Вы можаце даслаць на адрас рэдакцыі.

На думку Н. Аўдзеевай, з роднай мовай у нас ўсё добра

Як мы паведамлялі ў мінулым нумары газэты, маладыя франтаўцы замовілі ў гарвыканкаме грамадскі пікет у абарону роднай мовы. Усе вытрыманыя «параметры» звароту да ўлады аб правядзенні мерапрыемства не прынеслі, аднак, заяўнікам поспеху. У сваім, дарэчы, запозненым па нормах закону адказе, які падпісала нам старшыні гарвыканкаму Наталля Аўдзеева, улада паведамляе, што пікет «нецелесообразный», бо з выкладаннем і вывучэннем роднай мовы ў нашых школах усё добра, усё «в соответствии с правом выбора родителями языка обучения детей». Пра тое, што гэтае «целесообразное» права выбару насамрэч дыктуецца і нават навязваецца ўладай, у адказе не гаворыцца. Ды такое сумленнае прызнанне, дарэчы, зусім і не абавязковае: ўсё зразумела і без яго. Абвергнуць свае грэблівыя адносіны да мовы гарвыканкам не можа ніводнай гарадской афішай або абвесткай, афіцыйным выступам або дакумэнтам. Не гаворачы ўжо, зразумела, аб тым, якая мова пануе на шматлікіх паверхах Дома саветаў і наогул у чынавецкіх дачыненнях... Ды і тое сказаць, а ці жывуць яны ў Беларусі? Тэрытарыяльна — так. А думкамі і пачуццямі, пры ўмове наяўнасці, зразумела, адрас іх усё той жа, з незабыўных часоў камсамольскага юнацтва — савецкі саюз... І быццам анічоганькі ў свеце не змянілася. Між тым вартасць чалавека ў тым, што ён здольны і мусіць змяняцца. Разам з новымі ведамі, новым часам, новымі мэтамі, новымі надзеямі... А так бы і жылі людзі дасёння не тое, што ў неіснуючай краіне, а зусім у пяшчэрах. Ці не туды і цягнуць нас былыя камсамольцы?

Уласная інф.

По логике вещей — ненадолго!

Толькі што краіна адсвяткавала Дзень інвалідаў. Магілёў, як зазначыў бы класык, не пеставаў імяніннікаў «разнообразием дебютов». На гэтым тыдні інваліды мелі магчымасць бясплатна наведаць кінатэатры, каб паглядзець на сваё задавальненне (на жаль, далёка не першай «свежести») амерыканскія баявікі... А вось неўгамонны старшыня гарадскога таварыства пацярпелых ад савецкіх рэпрэсіяў В.Чашэй ізноў паведаміў рэдакцыі аб пакутах нявінных людзей, сярод якіх інваліды, да смутку, найбольш распаўсюджаная «катэгорыя». Звяртацца да ўладаў ён проста стаміўся. Вось урывак з ягонага ліста.

«Первого сентября 1995 г. указом президента отменены все льготы узникам сталинских лагерей и тюрем. В результате все они теперь лишены всех для себя жизненно важных льгот: бесплатного проезда в общественном транспорте, бесплатных лекарств по рецептам врачей, скидок на оплату жилья, телефона, электроэнергии. Если бывший узник сталинских лагерей не участник войны и не беспомощный инвалид, —он лишён всего для него продолжается 37-й год. Многочисленные обращения к президенту ничего не дали. Ответы к нам приходят не от него, а из других служб, которые ссылаются как раз на указ президента. Мы ощущаем, что живем в своеобразном историческом парадоксе по формуле: Государство — это Я, вернувшейся к нам из прошлых столетий. По логике вещей такое не может продолжаться долго.

В.ЧАШЕЙ,
председатель городского общества пострадавших от репрессий.

«Белая кніга». Магілёў. Фрагмэнты.

(Працяг. Пачатак у NN 17, 19, 21, 23, 25)

Могилевские власти признают только угодные им профсоюзы

Еще в апреле 1996 г. Совет Могилевской областной региональной организации Свободного профсоюза Белорусского (далее — МОРО СПБ) в соответствии с законом РБ «О коллективных договорах и соглашениях» и ст. 12 закона РБ «О профессиональных союзах» обратилась в Могилевский облисполком и Могилевскую ассоциацию промышленников и предпринимателей. Обращение состояло в просьбе начать коллективные переговоры с Советом МОРО СПБ о заключении Соглашения между указанными сторонами.

Однако, в нарушение Закона, облисполком (председатель — **Куличков А.Н.**) отказался вести переговоры. Кроме незаконности самого факта отказа, в ответе облисполкома имеется еще ряд нарушений действующего законодательства: участие МОРО СПБ в заключении коллективных договоров на предприятиях ставилось в зависимость от желания соответствующих трудовых коллективов, а не профсоюзов, функционирующих на предприятиях и учреждениях; вместо безусловного вступления в коллективные переговоры для заключения Соглашения с Советом МОРО СПБ, облисполком лишь обещал рассмотреть вопрос об участии МОРО СПБ в заключении контрактов при заключении соглашения в последующие годы. Это грубо нарушало принципы социального партнерства, заложенные в международном праве, национальном законодательстве и даже в Указе президента РБ N 278 «О развитии социального партнерства».

Из Могилевской ассоциации промышленников и предпринимателей (президент — **Чертков В.Г.**, директор завода «Трансмаш») вообще не поступило никакого ответа на предложение Свободного профсоюза начать коллективные переговоры.

Более того, облисполком не предоставил Совету МОРО СПБ копии соответствующих решений, положения и действующего соглашения, что не соответствует ст. 2 закона «О коллективных договорах и соглашениях», ст. 34 Конституции РБ, в которой говорится: «...*Государственные органы, общественные объединения, должностные лица обязаны предоставить гражданину Республики Беларусь возможность ознакомиться с материалами, затрагивающими его права и законные интересы*».

Не дал ответа облисполком и на просьбу включить в состав областной согласительной комиссии по трудовым и социальным вопросам представителя от Свободного профсоюза, что нарушает равенство прав всех профсоюзов, гарантируемое ст. 2 «Закона о профсоюзах».

Почему облисполком, грубо нарушая закон, не признает Свободного профсоюза? Почему на активистов Свободного дружно обрушились с репрессиями милиция и суды? Почему закрыла глаза прокуратура? Откуда такая «солидарность»?

